**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# НАЛІВАЙКА ЛЮДМІЛА ДЗМІТРЫЕЎНА

**МАСТАЦТВАЗНАВЕЦ, МАСТАЧКА, ДРАМАТУРГ**

**13 СНЕЖНЯ 1940 Г. – 31 ЛІПЕНЯ 2021 Г.**

**ФОНД № 428**

**ВОПІС № 1**

**1954–2010, коп. за 1919 – [1920-я] гг.**

**МІНСК 2023**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 428**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА | 1-47 | 1-5 |
| 1.1. | МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫЯ ПРАЦЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА | 1-4 | 1 |
| 1.2. | МАСТАЦКІЯ ПРАЦЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА | 5-37 | 1-4 |
| 1.2.1. | ПЕЙЗАЖЫ | 5-17 | 1-2 |
| 1.2.2. | КАМПАЗІЦЫІ І ІНШ. | 18-31 | 2-3 |
| 1.2.3. | ПАРТРЭТЫ І ІНШ. | 32-37 | 3-4 |
| 1.3. | П'ЕСЫ, ВЕРШЫ, ПЕРАКЛАДЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА І ІНШ. | 38-47 | 4-5 |
| 2. | ПІСЬМЫ ДА Л.Д. НАЛІВАЙКА | 48-55 | 5-6 |
| 3. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА І ІНШ. | 56-63 | 6-7 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Л.Д. НАЛІВАЙКА | 64-68 | 7 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 69-71 | 8-9 |

## Прадмова

**Налівайка Людміла Дзмітрыеўна** нарадзілася 13 снежня 1940 г. у сям'і настаўніка ў Гродна (згодна з памылковым запісам у пашпарце – у Істры Маскоўскай вобласці РСФСР)[1]. У 1958 г. скончыла СШ № 1 Гродна. У 1958–1963 гг. вучылася на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава (цяпер – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава). У 1963–1965 гг. працавала мастаком-афарміцелем у [Гродзенскім абласным драматычным тэатры], настаўніцай малюнка ў школе, у 1965–1976 гг. – у Гродзенскіх мастацка-вытворчых майстэрнях. У 1976 г. паступіла ў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Акадэміі навук БССР, дзе ў 1977–1997 гг. працавала ў аддзеле выяўленчага мастацтва. У 1993–1994 гг. праходзіла навуковую стажыроўку ў Інстытуце Расіі і Усходняй Еўропы ў Фінляндыі, займалася тэмай "Беларускі перыяд творчасці фінскага мастака А.П. Ахола-Вало". У 1997 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю "Мастацкае жыццё Беларусі. 1917–1932. Плакат, часопісная і газетная графіка" (кіраўнік – С.В. Марцэлеў). У 1998 г. была запрошана (як адзіны ў Беларусі даследчык і спецыяліст па графіцы 1920–1930-х гг.) на працу ў аддзел беларускага мастацтва ХХ-ХХІ стагоддзяў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь[2].

У архівах, бібліятэках і музеях Беларусі, Літвы, Расіі і Фінляндыі выявіла звыш 100 экзэмпляраў беларускага агітплаката, шматлікія прыклады "маладнякоўскай графікі"; склала хронікі мастацкага жыцця Вільні, Віцебска, Гомеля, Мінска і Смаленска ў 1917–1991 гг.; увяла ў навуковы зварот творчасць графікаў Аляксандра Ахола-Вало, Паўла Гуткоўскага, Уладзіслава Стржэмінскага і Мікалая Тарасікава[3]; напісала 2 раздзелы для 4-га тома "Гісторыі беларускага мастацтва. У 6-ці т." (Мінск, 1991) і больш 200 мастацтвазнаўчых прац для перыядычных і асобных выданняў[4]; брала ўдзел у міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях і круглых сталах.

У час працы ў Гродна прычынілася да мастацкага афармлення горада: мазаіка на сцяне гарадскога ЗАГСа, афармленне металічнай паласой кафе "Рамантыка", роспіс па бетону рэстарана "Сосны" і інш. Працавала як графік, манументаліст. Прымала ўдзел у выставачнай дзейнасці (10 рэспубліканскіх і 2 усесаюзных выставы). Мастацкія творы Л.Д. Налівайка захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (графічныя аркушы "Гродна" (лінарыт, 1969) і "Інтэр'ер" (аква, 1972) і БДАМЛМ. У апошнія гады жыцця займалася роспісам па батыку.

Пасля знаёмства з тэатразнаўцай В.М. Козел-Ярмалінскай занялася драматургіяй. Напісала п'есы (у т.л. пад псеўданімам Л. Айка): "Варыянт для

---

[1] Аўтабіяграфія Л.Д. Налівайка (БДАМЛМ, Ф. 428, Воп. 1, Спр. 46: 1).

[2] Н.М. Усава. "Памяці Людмілы Дзмітрыеўны Налівайка". // https://artmuseum.by/events-news/pamiatci-liudmily-dzmitryeuny-nalivaika.

[3] Там жа.

[4] Аўтабіяграфія Л.Д. Налівайка (БДАМЛМ, Ф. 428, Воп. 1, Спр. 46: 8–9).

канца стагоддзя” = “Конь у Чырвоным паліто” (2 часткі якой былі надрукаваны ў часопісе клуба “Спадчына”) (1995–1997), “Голубка Лидка и дочка генерала К.” (1996–1997) і інш.

Людміла Дзмітрыеўна Налівайка памерла 31 ліпеня 2021 года. Пахавана ў [Мінску].

Дакументы Л.Д. Налівайка паступілі ў БДАМЛМ у 1998 г. і 1999 г. ад самой фондаўтваральніцы. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1 у колькасці 72 справы (345 дакументаў) за 1954–2010 гг., коп. за 1919 – [1920-я гг.].

Вопіс складаецца з 5 раздзелаў:

Першы раздзел – “Творчыя дакументы Л.Д. Налівайка” – складаецца з трох падраздзелаў: мастацтвазнаўчыя працы Л.Д. Налівайка; мастацкія працы Л.Д. Налівайка (апошнія прадстаўлены ў падпадраздзелах – пейзажы, кампазіцыі, партрэты і інш.); п’есы, вершы, пераклады і інш. Л.Д. Налівайка. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па жанрах і храналогіі (1954–2010).

У другім раздзеле – “Пісьмы да Л.Д. Налівайка” – змешчаны пісьмы ад вядомых мастакоў і мастацтвазнаўцаў, родных і знаёмых. Справы сістэматызаваны па алфавіце прозвішчаў карэспандэнтаў, у межах перапіскі з адной асобай – па храналогіі (1967–2003).

Трэці раздзел – “Асабістыя дакументы Л.Д. Налівайка і інш.” – складаюць буклет, каталогі і ўлёткі мастацкіх выстаў з удзелам Л.Д. Налівайка, дакументы аб наведванні ёй Польшчы і Фінляндыі, яе інтэрв’ю, артыкулы са згадкай Л.Д. Налівайка і інш. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (1966–2010).

У чацвёртым раздзеле – “Дакументы, сабраныя Л.Д. Налівайка,” – прадстаўлены дакументы Аб’яднання беларускіх мастакоў Балтыі “Маю гонар” і беларуска-эстонскага згуртавання “БЭЗ”, рэпрадукцыі і фатаграфіі мастацкіх прац С. Блоха, А.Я. Быхоўскага, К.М. Геда, П.М. Гуткоўскага і інш. (1920-я гг.) і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе, унутры справы 67 – па алфавіце прозвішчаў мастакоў ([1980-я гг.] – 2003).

Пяты раздзел – “Выяўленчыя дакументы” – складаецца з групавых фатаграфій Л.Д. Налівайка і фатаграфій Д.І. Налівайка (бацькі), індывідуальнай і групавой (1948–1996, коп. за 1925 г.).

Прадмову склала
заг. аддзела В.Ф. Шаталава

18.10.2023 г.

Установа "Беларускі дзяржаўны
архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 428
ВОПІС № 1
1954-2010, коп. за 1919 - [1920-я гг.]

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 20.10.2023
№ 12

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА** | | | | |
| | **1.1. МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫЯ ПРАЦЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА** | | | | |
| 1 | "Художественная жизнь Беларуси. 1917-1932 (Плакат, журнальная и газетная графика)". Кандыдацкая дысертацыя. Без тытульнай старонкі. Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай і уклейкай у пераплёце | 1997 | 105 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 2 | "Народное творчество Гродненской области". Рэферат з фотаілюстрацыямі. Машынапіс з уклейкай у пераплёце | 1976 | 46 | 1 | |
| 3 | "Адважны фін Ахала-Вало свае сімвалы знайшоў у Віцебску...", "Творчы лёс мастака Мініна Я.С." і інш. Артыкулы (адзін - сумесна з Я.Ф. Шумейкам). Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай, машынапіс, ксеракопіі з перыядычных выданняў | [1980-я гг.] - 2000 | 47 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 4 | Рэцэнзія на 1-ы том "Ад старажытных часоў да другой паловы XVI стагоддзя" выдання "Гісторыя беларускага мастацтва. У 6-ці т." (Мінск: "Навука і Тэхніка", 1987) у бюлетэні. Друкаванае выданне | 1988 | 71 | 1 | |
| | **1.2. МАСТАЦКІЯ ПРАЦЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА** | | | | |
| | **1.2.1. ПЕЙЗАЖЫ** | | | | |
| 5 | "Гродна". Гарадскі пейзаж. Малюнак. Папера, аловак | 1954 | 1 | 1 | |
| 6 Вял. фарм. | "Чароўны куток. Гродна". Малюнак. Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1972-1998 | 2 | 1 | |
| 7 | "Ля Каложы. Гродна". Малюнак. Папера, лінагравюра | 1975 | 2 | 1 | |
| 8 Вял. фарм. | "Нёман і Гараднічанка". Накід. Кардон, каляровыя крэйды | 1993 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | "Пейзаж. Ля берага". Малюнак.<br>Папера, гуаш | 1997 | 1 | 1 | |
| 10 | "Нёман - бацька мой". Малюнак.<br>Папера, гуаш | 1998 | 1 | 1 | |
| 11<br>Вял. фарм. | "Каложа. Гродна".<br>Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1998-1999 | 2 | 1 | |
| 12<br>Вял. фарм. | "Мой стары двор (Шагал плюс Тарасікаў)".<br>Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1999 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 13 | "Манастыр. Эстонія". Малюнак.<br>Папера, пастэль, шарыкавая ручка | 1990 | 1 | 1 | |
| 14 | "Манастыр Курэмяэ". Малюнак.<br>Папера, пастэль, шарыкавая ручка | 1990 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 15 | Графічныя працы з гарадскімі пейзажамі і інш.<br>Папера, туш | [1970-я - 1990-я гг.] | 7 | 7 | |
| 16 | "Байкі на возеры Айпа" = "Ночью на озере Айпа". Малюнак.<br>Кардон, пастэль, шарыкавая ручка | 1994-1997 | 1 | 1 | |
| 17<br>Вял. фарм. | "На алеі Сібеліуса", "Прамень Ахола", "Успаміны аб Фінляндыі" і інш. Малюнкі з фінскай серыі.<br>Папера, акварэль, каляровыя алоўкі | 1994-1998 | 4 | 4 | |
| | **1.2.2. КАМПАЗІЦЫІ І ІНШ.** | | | | |
| 18 | "Адбітак". Малюнак.<br>Папера, змяшаная тэхніка | 1976-1998 | 1 | 1 | |
| 19<br>Вял. фарм. | "Ганімая". Малюнак.<br>Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1976-1998 | 2 | 1 | |
| 20 | "Блукаючая зорка". Малюнак.<br>Папера, графіт | 1998 | 1 | 1 | |
| 21 | "Габелены жыцця", "Заутренняя молитва" і інш. Малюнкі.<br>Папера, акварэль | 1998 | 3 | 3 | |
| 22<br>Вял. фарм. | "Ідзі ў манастыр...". Малюнак.<br>Пастэль, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1998 | 2 | 1 | |
| 23<br>Вял. фарм. | "Святыя на дзядзінцы". Малюнак. | 1998 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | | | | |
| 24 Вял. фарм. | "У забыцці". Малюнак. Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1998 | 2 | 1 | |
| 25 Вял. фарм. | "Цені былога". Малюнак. Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1998 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 26 | "Фантан і ніяды". Малюнак. Папера, гуаш, фламастэр | 1996 | 1 | 1 | |
| 27 Вял. фарм. | ["Падводнае царства"]. Малюнак. Папера, гуаш | [1998] | 1 | 1 | |
| 28 Вял. фарм. | "Плыт "Мядузы". Ілюстрацыя да рамана [А. Барыка] "Мора-акіян". Папера, змяшаная тэхніка (пастэль, гуаш) | 1998 | 2 | 1 | |
| 29 | "Подводное царство". Малюнак. Папера, змяшаная тэхніка | 1998 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 30 | "Натюрморт-2". Малюнак. Папера, гуаш | 1996 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 31 | Ілюстрацыі да вершаў В. Хлебнікава. Папера, акварэль, каляровыя алоўкі, шарыкавая ручка | 1998 | 2 | 2 | |
| | **1.2.3. ПАРТРЭТЫ І ІНШ.** | | | | |
| 32 | "Аўтапартрэт з нарцысамі". Малюнак. Папера, акварэль, аловак | 1998 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 33 | "Алеся", "Суседка". Эскізы партрэтаў. Партрэты маці, сына і Н.І. Стужынскай. Накіды. Папера, акварэль, аловак, каляровы аловак, шарыкавая ручка | 1971-1998 | 5 | 5 | |
| 34 | "Партрэт сына". Мяккі кардон, пастэль | 1987 | 1 | 1 | |
| 35 | "Дзіма". Накід партрэта. Папера, сэпія | 1996 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 36 | Агітплакат. Фрагмент.<br>Папера, гуаш | [1980-я гг.] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 37 | Накіды людзей, жывёлаў і інш.<br>Папера, аловак, шарыкавая ручка | [1980-я<br>- 1990-я гг.] | 9 | 9/24 | |
| | *** | | | | |
| 38 | Фатаграфіі і рэпрадукцыі мастацкіх прац<br>Л.Д. Налівайка "Деревенская жизнь",<br>"На лекции" і інш. | 1963 -<br>[1980-я гг.] | 4 | 4/6 | |
| | **1.3. П'ЕСЫ, ВЕРШЫ, ПЕРАКЛАДЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА І ІНШ.** | | | | |
| 39 | "Варыянт для канца стагоддзя" = "Конь у чырвоным паліто" = "Хваля". Гістарычная п'еса. Сцэнарый і фрагменты сцэнарыя. Варыянты.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай<br>і дапіскамі, ксеракопія машынапісу | 1995-1997 | 130 | 9 | |
| 40 | "Голубка Лидка и дочка генерала К." = "Табернакль". Гістарычны дэтэктыў у 4-х дзеях. П'еса. Сцэнарый (фрагменты). Варыянты.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, дапіскамі і ўклейкай | 1996-1997 | 78 | 4 | |
| 41 | "Солнечная поляна (Надежда, которая пишется нами)" (суаўтар Я.Ф. Шунейка). П'еса.<br>Машынапіс | 1997 | 18 | 1 | |
| 42 | Разгорнуты змест п'есы ў 3-х дзеях "Слупы", змест, пралог і эпілог п'есы ў 4-х дзеях "Эммигранты", згадка пра п'есу "Даць зарок".<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, дапіскамі і ўклейкай, машынапіс | 1998 -<br>[1990-я гг.] | 37 | 3 | |
| 43 | Накіды дэкарацый і размяшчэння персанажаў, зробленыя Л.Д. Налівайка для сваіх п'ес.<br>Папера, шарыкавая ручка | [1995]-1998 | 55 | 12 | |
| | *** | | | | |
| 44 | "Мастак", "Смех и плачь". Падборкі вершаў і інш. за 1958-2008 гг.<br>Аўтарызаваны машынапіс | 2010 | 20 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 45 | Т.Вуола (T.Vuolo) "Востраў ЭЛПО", "Маці сусвету" і інш. Вершы. У перакладзе Л.Д. Налівайка (сумесна з А. Ахола-Вало) з фінскай на беларускую і рускую мовы.<br>Машынапіс з праўкай Л.Д. Налівайка.<br>На Лл. 17-34 - зборнік вершаў Т. Вуола на фінскай мове (няпоўны) (ксеракопія з друкаванага выдання) (1990) | 1990-1994 | 34 | 2/18 | |
| | *** | | | | |
| 46 | "К истории художественной жизни Витебска (1918-1922 гг.). Збор дакументаў. Прадмова і ўкладанне Л.Д. Налівайка.<br>"Буклет выстаўкі "Язэп Драздовіч (1888-1954). Гістарычная архітэктура. Народнае драўлянае дойлідства. Краявіды. Графіка 1920-30-х гадоў" у філіяле "Архітэктурны комплекс XVI-XVIII тст." у вёсцы Гальшаны. Укладальнікі Л.Д. Налівайка, В.А. Архіпава.<br>Друкаваныя выданні | 1994, 1999 | 31 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 47 | Аўтабіяграфіі Л.Д. Налівайка.<br>Аўтограф, ксеракопія аўтарызаванага машынапісу | 1999, 2002 | 14 | 2 | |
| 48 | Бібліяграфія навуковых прац Л.Д. Налівайка за 1977-1998 гг.<br>Машынапіс | | 4 | 1 | |
| | **2. ПІСЬМЫ ДА Л.Д. НАЛІВАЙКА** | | | | |
| 49 | Віншавальныя паштоўкі і пісьмо Д.П. Генеральскага, А. Падліпскага і інш. да Л.Д. Налівайка (Беларусь) | 1967-1997 | 5 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 50 | Паштоўка і пісьмы М. Астраумавай (5) да Л.Д. Налівайка (Эстонія).<br>На Лл. 9-10 - фота Л.Д. Налівайка з М. Астраумавай і інш. [2003] | [1987]-2003 | 11 | 7 | |
| 51 | Паштоўка і пісьмы М. Белямука і С. Белай (ЗША), Л. Бічайкінай (3) (Фінляндыя) да Л.Д. Налівайка | 1996-1997, [1990-я гг.] | 7 | 4 | |
| 52 | Паштоўкі і пісьмы В. Дзяшко, Е. Кавальчыка (на польскай мове) (Польшча), Я. Кузьміцкага (4) (Швецыя) да Л.Д. Налівайка. | 1991-1997 | 13 | 8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | На Лл. 9-10 - фота [Л.Д. Налівайка], Я. Кузьміцкага [1996] | | | | |
| 53 | Пісьмы С. Мітчэла да Л.Д. Налівайка (Вялікабрытанія) | 1997-1998 | 17 | 6 | |
| 54 | Пісьмы М. Рууска-Лапі (на англійскай і рускай мовах), В. Суонпээ (Suonpää) (на англійскай мове) (Фінляндыя), В. Целеша (Латвія) да Л.Д. Налівайка | 1982-1997 | 10 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 55 | Паштоўкі, пісьмо і тэлеграма ад сваякоў і родных да Л.Д. Налівайка (Беларусь) | [1960-я гг.] - 1997 | 14 | 13 | |
| | *** | | | | |
| 56 | Дароўны надпіс А. Ахола-Вало Л.Д. Налівайка на каталозе мастацкай выстаўкі Тару Салміо (яго жонкі) ад 25.08.1991 г. Друкаванае выданне на фінскай мове | | 10 | 1 | |
| | **3. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Л.Д. НАЛІВАЙКА І ІНШ.** | | | | |
| 57 | Буклет і ўлётка персанальных мастацкіх выставак Л.Д. Налівайка (Беларусь, 1999 і Эстонія, 2001). Каталогі мастацкіх выстаў з удзелам Л.Д. Налівайка. Друкаваныя выданні | 1966-2001 | 184 | 14 | |
| 58 | Акт паступлення акварэльнага малюнка Л.Д. Налівайка ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР | 1972 | 1 | 1 | |
| 59 | Пасведчанне чытача Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі на імя Л.Д. Налівайка | [1990-я гг.] | 2 | 1 | |
| 60 | Дакументы аб наведванні Л.Д. Налівайка Польшчы і Фінляндыі (запрашэнне грамадскай арганізацыі Фінляндыі для захавання і распаўсюду ведаў пра творчасць А. Ахола-Вало на імя Л.Д. Налівайка, пісьмо дырэктара Мастацкага музея ў Лодзі (Польшча) у Беларускае таварыства сяброўства і культурнай сувязі з замежнымі краінамі з просьбай спрыяць Л.Д. Налівайка ў афармленні дакументаў на выезд і інш. (на беларускай, польскай і рускай мовах) | 1991-1997 | 7 | 4 | |
| 61 | Праграмы навуковых канферэнцый "Уладзімір Стрэмінскі на радзіме" (Мінск-Вілейка, 1993) "Традыцыі мастацкай школы і сучасныя тэндэнцыі яе развіцця" (Мінск, 1997) і інш. з удзелам | 1993-1998 | 9 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Л.Д. Налівайка | | | | |
| | *** | | | | |
| 62 | Рэцэнзія Л. Грышчанкі на п'есу Л.Д. Налівайка "Чырвоны калідор". Аўтарызаваны машынапіс | 1996 | 1 | 1 | |
| 63 | Інтэрв'ю Л.Д. Налівайка Л.Сяліцкай. В.У. Быкаў "Талент і пошук. Пра маладых мастакоў Гродна", А.І. Мальдзіс "Сын трёх народов" і інш. Артыкулы са згадкай Л.Д. Налівайка. Выразка і ксеракопіі з перыядычных выданняў | 1970-2010 | 5 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 64 | Віншавальная тэлеграма ад Віцебскага абласнога краязнаўчага і мастацкага музеяў Л.Д. Налівайка з юбілеем | 2000 | 1 | 1 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Л.Д. НАЛІВАЙКА** | | | | |
| 65 | Брашура і каталог мастацкай выстаўкі Аб'яднання беларускіх мастакоў Балтыі "Маю гонар" (на беларускай і [латышскай] мовах). Брашура беларуска-эстонскага згуртавання "БЭЗ" і інш. (на англійскай, беларускай і [эстонскай] мовах). Друкаваныя выданні | 1996-2003 | 41 | 6 | |
| 66 | Артыкул В. Архіпавай пра А. Ахола-Вало і інш. Ксеракопія аўтарызаванага машынапісу і ксеракопія з перыядычнага выдання, газета "Русский свет" (№ 2, 1994) (Фінляндыя) | 1991-2010 | 7 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 67 | Мастацкія працы С. Блоха (ілюстрацыі), А.Я. Быхоўскага (агітплакаты), К.М. Геда (малюнкі), Г.Я. Змудзінскага (карыкатуры, плакаты і інш.), Я. Разанава (партрэты, карэкатуры і інш.), Р.М. Семашкевіча (ілюстрацыі і інш.) і інш. за 1919 - [1920-я гг.]. Рэпрадукцыі і фатаграфіі | | 47 | 45 | |
| 68 | Агітплакаты, ілюстрацыі да перыядычных выданняў і інш. П.М. Гуткоўскага за 1921-1926 гг. Рэпрадукцыі і фатаграфіі | | 46 | 45/47 | |
| 69 | Агітплакаты і малюнкі А.М. Тычыны і інш. за 1919 - [1920-я гг.] Рэпрадукцыі і фатаграфіі | | 52 | 51 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 70 | Фатаграфіі Л.Д. Налівайка ў групах з аднакласнікамі, аднакурснікамі мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава і інш.<br>Арыгіналы і рэпрадукцыя | 1948-1963 | 7 | 7 | |
| 71 | Фатаграфіі Л.Д. Налівайка ў групах з А.Я. Белым, Л.М. Лычом, А.П. Грыцкевічам і інш. пасля адкрыцця выставы "Дзеячы нацыянальнага Адраджэння Беларусі" (Мінск) і інш. | [1970-я гг.], 1996 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 72 | Фатаграфіі Д.І. Налівайка (бацькі), індывідуальная і ў групе з іншымі кавалерыстамі Чырвонай арміі ў Самары.<br>Арыгінал, копія | 1979,<br>коп. за 1925 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 72 (семдзесят два)

спраў з № 1 па № 72 , 345 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

заг. аддзела НТА ______________________ В.Ф. Шаталава

17.10.2023

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння ______________________ В.І. Бярэйшык

захаванасці дакументаў ______________________

"_____"____________20____ г.